ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983 12 МАЯ ЧАЦВЕР № 18 (1394)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт" тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

## РЭСПУБЛІКАНСКІ СЕМІНАР

на тэму «Аб далейшым удасканаленні сацыялістычнага спаборніцтва ў вышэйшых навучальных установах» правадзіўся на базе БДУ імя У. І. Леніна МінВНУ БССР і Беларускім рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў. Адкрыў семінар намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі С. А. Малевіч. З паведамленнем аб уплыве сацыялістычнага спаборніцтва на павышэнне эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна выступіў старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў Э. В. Шастаковіч.

Удзельнікі семінара азнаёміліся з работай прафсаюзнай арганізацыі універсітэта.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## КЛУБ КНІГАЛЮБАЎ

універсітэта праводзіць арганізацыйныя пасяджэнні па секцыях: навукова-фантастычнай літаратуры — 18 мая ў аўдыторыі 210 галоўнага корпуса (кіраўнік М. І. Арэхаў); фальклору — 20 мая ў аўдыторыі 38 філалагічнага факультэта (кіраўнік Л. М. Салавей); рэдкай і каштоўнай кнігі — 23 мая ў пакоі 20 геаграфічнага факультэта (кіраўнік А. А. Сінькевіч); паэзіі — 25 мая ў аўдыторыі 38 філалагічнага факультэта (кіраўнік І. С. Скарапанава).

Пачатак пасяджэнняў у 19 гадзін.

Р. КАВАЛЁВА,
старшыня клуба кнігалюбаў Маскоўскага раёна г. Мінска.

## ЗАСТАЮЦЦА Ў СТРАІ

ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Гэта яшчэ раз пацвердзіў урачысты сход-віншаванне работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта. Былых франтавікоў і партызан павіншавалі прарэктар па гаспадарчай частцы У. І. Сілін, сакратар парткома М. Г. Елісееў, сакратар камітэта камсамола універсітэта Аляксандр Казулін.

В. ГРАМОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

## НА ГАРАДСКІМ ЗЛЁЦЕ

аператыўных камсамольскіх дружыннікаў, у якім прынялі ўдзел і прадстаўнікі універсітэта, падведзены вынікі дзейнасці, намечаны мерапрыемствы па паляпшэнню прафілактычнай і выхаваўчай работы сярод падлеткаў.

А. ЖЫГУЛІН.

# ...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ

ФОТАРЭПАРТАЖ









І вось — апошні бой. Яго прынята лічыць самым галоўным. Але тыя, каму неўзабаве ўручаць дыпломы, не губляюцца.

Наш карэспандэнт пабываў на дзяржаўных экзаменах па навуковаму камунізму ў студэнтаў філасофскага аддзялення гістфака.

**НА ЗДЫМКАХ: члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі Адам Пятровіч Мельнікаў, Аляксандр Іванавіч Сінікін і Нэллі Піменаўна Густоўская ўважліва слухаюць кожнага выпускніка; добрыя веды паказаў студэнт з Кубы Амар Гусман Мірандо; ці шчаслівы білет?; апошнія ўдакладненні перад экзаменам. В. Шачак.**

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# Захопленасць і ўменне

ЯГО ПРОЗВІШЧА называюць сярод выдатнікаў хімічнага факультэта адным з першых. І гэта не дзіўна: за час вучобы ва універсітэце Вячаслаў Ільянкоў атрымаў усяго толькі тры чацвёркі. Астатнія адзнакі — выдатныя.

Вучням Віцебскай сярэдняй школы № 2, у якой займаўся Ільянкоў, пашанцавала на настаўнікаў — захопленых, адданых любімай справе. Аднак з асаблівай прыхільнасцю успамінае ён Святлану Антонаўну Жарыну. Ды ці ён адзін? Сёння на хімічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна займаецца сем былых вучняў Святланы Антонаўны — больш, чым з усіх астатніх школ Віцебска, разам узятых.

Хімія, як кажуць, «пайшла» ў яго з самага пачатку. Што там да прасцейшых ураўненняў, калі ўжо ў сёмым класе Слава перачытаў амаль усе падручнікі па арганічнай і неарганічнай хіміі, якія трапілі яму ў рукі. Затым былі школьныя, гарадскія алімпіяды па хіміі, тры гады запар прадстаўляў Ільянкоў родную вобласць на рэспубліканскіх спаборніцтвах юных хімікаў.

Паступова захапленне перарасло ў любоў, любоў — у адданасць. І вось сёння Вячаслаў Ільянкоў, студэнт чацвёртага курса, марыць стаць спецыялістам у галіне фізічнай хіміі.

На пытанне, што ўяўляе сабой фізічная хімія, Ільянкоў адказвае словамі загадчыка кафедры прафесара Аліма Аляксандравіча Вечара:

«Калі філасофія з'яўляецца навукай усіх навук, то фізічная хімія— аснова хіміі ў цэлым. Перш чым на «белы свет» паявіцца нейкае новае рэчыва, магчымасць яго «нараджэння» падкажа фізхімік».

Іменна за гэтае «лідэрства», за шырокае поле дзейнасці і абраў Ільянкоў у свае спадарожнікі фізічную хімію. З захапленнем працуе над курсавой работай «Тэрмадынамічныя ўласцівасці трайной сістэмы: волава — свінец— індый» пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі дацэнта Л. А. Мячкоўскага. Да змяркання можа прасядзець за разлікамі: яшчэ адна асаблівасць абранай ім навукі — спалучэнне дакладнасці матэматыкі са строгасцю хіміі.

Вучоба Ільянкову даецца лёгка. «Прычына» гэтага — уменне лагічна мысліць і, безумоўна, захопленасць. Правільней нават будзе, калі мы пераставім месцамі эпітэты: захопленасць і ўменне. Гэтыя якасці адзначылі ў ім і таварышы. А хто больш аб'ектыўна ўбачыць недахопы і вартасці, як не яны?

І наогул Вячаслаў Ільянкоў можа многае: выдатна вучыцца, добра працаваць (гэта пацвердзіў будатрад — Ільянкоў быў у Пскоўскай вобласці, у Карэліі), можа павесці за сабой таварышаў у любой карыснай справе (ён член бюро камсамольскай групы). Ёсць у яго для гэтага здольнасці, ёсць магчымасці і, спадзяёмся, жаданне...

А. ФАМІЧОЎ.

ФОТАРЭПАРТАЖ

# Універсітэцкі ВЦ



ВЫЛІЧАЛЬНЫ цэнтр БДУ імя У. І. Леніна быў створаны ў 1959 годзе. Цяпер ВЦ аснашчаны навейшымі ЭВМ. Супрацоўнікі вылічальнага цэнтра — а іх тут 220 чалавек — выпускнікі мехмата, ФПМ, факультэта радыёфізікі і электронікі вядуць даследаванні па адзінаццаці тэмах.

ВЦ падтрымлівае цесную сувязь з факультэтамі. Супрацоўнікі цэнтра чытаюць лекцыі на мехмаце і ФПМ, з'яўляюцца кіраўнікамі студэнцкай практыкі. Акрамя таго, трывалыя навуковыя кантакты існуюць і з іншымі ВНУ рэспублікі, многімі НДІ АН БССР.

Эканамічны эфект ад распрацовак супрацоўнікаў вылічальнага цэнтра склаў у мінулым годзе 1 млн. 300 тыс. рублёў.

**НА ЗДЫМКАХ: аператар Ларыса ДАШКЕВІЧ займаецца на вячэрнім аддзяленні фізфака; у перфаратарнай «ЕС-1022; аператар Таццяна КЕНЧЫК.**

Тэкст і фота **В. Шачака.**





САТЫРЫЧНЫМ ПЯРОМ

# ПАД ЛЯЖАЧЫ КАМЕНЬ...

ЗДАЕЦЦА, колькі існуюць сталовыя, столькі іх і крытыкуюць. І калі людзі, каб завязаць знаёмства, заводзяць размову аб надвор'і, дык студэнтам дастаткова абмяняцца думкамі наконт работы і якасці страў іх сталовых.

— Слухай, учора зайшоў паабедаць, а на сталах кветкі, сурвэткі аднекуль паявіліся. Што, думаю, здарылася? Нашы казалі — камісію чакаюць...

— А ў нас нядаўна блінчыкі з мясам былі. Во, думаю, добра, нарэшце асвоілі прыгатаванне. Да толькі адзіны раз у маім сталоўскім жыцці парадаваўся. Больш гэтага «далікатэсу» не бачылі.

Чаго толькі не пачуеш, калі ў цябе ёсць час і жаданне разважаць на гастранамічныя тэмы! Размовы гэтыя часта нагадваюць вядомыя байкі рыбакоў ці паляўнічых: хто прыдумае больш неверагоднае, той і герой. Але, на жаль, ёсць у гэтых прывычных скаргах доля ісціны. І немалая доля. Якая іменна? Вось гэта і паспрабаваў удакладніць няштатны аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і быту камітэта народнага кантролю БДУ сумесна з «Камсамольскім пражэктарам». У выніку праверкі работы сталовых №№ 33, 61, галоўнага і хімічнага карпусоў, інтэрната № 7, НДІ ПФП, СКТБ, якая праводзілася ў студзені гэтага года, выяўлены парушэнні санітарна-гігіенічных норм і правіл грамадскага харчавання, а таксама некаторыя тэхнічныя парушэнні.

Агульным для ўсіх сталовых з'яўляецца адсутнасць... мыла ў рабочых памяшканнях. Не хацелася б думаць, што работнікі сталовых бяруцца за прыгатаванне сняданкаў, абедаў і вячэр бруднымі рукамі. Хутчэй за ўсё, ім вядомы нейкі, пакуль што недаступны сучаснай навуцы спосаб захоўваць іх чыстымі ў любых абставінах і на пэўны — у строгай адпаведнасці з працягласцю працоўнага дня — час. А калі няма мыла, дык аўтаматычна адпадае патрэба ў індывідуальных ручніках для повараў. Якая эканомія! (Дарэчы, таксама характэрная для ўсіх азначаных «кропак харчавання»). А ўжо гумавыя дыванкі каля электрапліт — асноўнае патрабаванне тэхнікі бяспекі — зусім непатрэбная раскоша.

Гэта, так сказаць, агульныя заўвагі. А вось і індывідуальныя. У сталовых №№ 33, 61, у галоўным корпусе патрабуецца замена часткі раздзелачных дошак, калод для рубкі мяса. Не па прызначэнню выкарыстоўваюцца памяшканні ў сталовых №№ 33, 61. Акрамя таго, што ў памяшканні моечнай тары сталовай № 33 утульна размясціліся зусім там не «прапісаныя» паперы і флягі, сталовая можа ганарыцца такім упрыгожаннем, як узоры цвілі на столі. Напэўна, прытрымліваючыся правіл гульні ў «блытаніну», тон якой задалі работнікі сталовай № 61, размясціўшы тару з-пад малака ў варачным цэху, наведвальнікі гэтай сталовай прынялі абедзенную залу за гардэроб і спакойна разгульвалі па ёй у верхнім адзенні. Але ўсё, як кажуць, пазнаецца ў параўнанні. Чаго варты адзначаныя вышэй «дробязі», калі ў сталовай інтэрната № 7, напрыклад, выйшаў са строю выпарнік у маразільнай камеры, зусім не працуе душ, нерэгулярна вывозіцца смецце, няма спецыяльных кантэйнераў для адходаў у сталовай галоўнага корпуса, адчуваецца неабходнасць у рамонце кухні і падсобных памяшканняў сталовых № 33, СКТБ, інтэрната № 7, галоўнага і хімічнага карпусоў, не хапае спецвопраткі ў работнікаў сталовых № 61, 33!..

Праверка адбылася ў студзені. Тады ж КНК прапанаваў як мага хутчэй ліквідаваць выяўленыя недахопы. На двары май. Што зроблена?

У прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Сіліна адбылася нарада па пытанню ліквідацыі заўваг па рабоце аб'ектаў грамадскага харчавання, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі трэстаў сталовых Маскоўскага і Кастрычніцкага раёнаў. На нарадзе высветлілася, што для таго, каб пазбавіцца ад многіх недахопаў, патрэбны былі мінімальныя намаганні. Тыя ж самыя шматпакутныя дыванкі. Чаго прасцей! Патрэбны? Звяртайцеся на склад БДУ.

Для даведкі:

«Па стану на 4 мая 1983 года на складзе універсітэта маецца дыванкоў дыэлектрычных 840 кг». (Са службовай запісі аддзела забеспячэння).

Але вось даведацца ніхто не пажадаў. Не палічылі патрэбным.

Да пытання аб смецці. У сувязі з будаўніцтвам метро ўскладніўся доступ транспартных сродкаў да сталовай галоўнага корпуса, таму гарадскія арганізацыі адмаўляюцца ўстанаўліваць кантэйнеры для смецця і вывозіць іх. Работнікі сталовай таксама не жадаюць арганізаваць уборку сваімі сіламі. Рэзультатам абмеркавання стала наступнае кампраміснае рашэнне: адходы будуць збірацца ў поліэтыленавыя мяшкі і вывозіцца транспартам БДУ.

Аб сурвэтках. «Не хапае сурвэтак і спецвопраткі — іх няма ў горадзе». (З даведкі загадчыцы сталовай № 33).

Атрымліваецца, што не пазней чым учора мне неверагодна пашанцавала: купіла пачку сурвэтак у магазіне, нават і не падазраючы, што натрапіла на страшэнны дэфіцыт...

Былі і іншыя пытанні. Напэўна, няма сэнсу ўсе іх пералічваць. Як, увогуле, і не было сэнсу даводзіць, каб элементарныя патрабаванні, прад'яўляемыя да сталовых, пераraсталі ў праблемы, для вырашэння якіх спатрэбіліся спецыяльныя рэйды і нарады.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш кар.**

# ІХ ВІТАЮЦЬ СВІТАНКІ Ў ЛЕСЕ

СЯБРЫ ПРЫРОДЫ

ЗАРАЗ НІХТО дакладна не памятае, з чаго ўсё пачалося. Відавочна адно: справа, падмурак якой быў закладзены ў 1972 годзе, жыве і па сённяшні дзень. Дзесяць гадоў... Многа гэта ці мала? Для студэнтаў — вялікае дасягненне, бо непазбежная «змена пакаленняў» ставіць знак часовасці на ўсіх пачынаннях і нават традыцыях. На біяфаку ў 1978 годзе здарылася наступнае. Пакаленне пачынальнікаў пакінула сцены факультэта, а тых, хто б прадоўжыў яго справу, — не было. Аднак застаўся «апошні з магікан» — выкладчык Алег Канстанцінавіч Фядосаў. Адсюль пачынаецца новы віток у гісторыі існавання дружыны па ахове прыроды.

Знешне ўсё вельмі проста і нават нецікава. Кожную нядзелю, звычайна ў пяцьшэсць гадзін раніцы, аператыўная група дружыннікаў збіраецца на Прывакзальнай плошчы, садзіцца ў адну з электрычак, каб ехаць у Пухавіцкі, Смалявіцкі, Лагойскі ці іншы раён. Там блукае па лясах, рачных плёсах, берагах азёр — шукае браканьераў.

Яшчэ адзін штрых. Удзел у рабоце дружыны не дае ніякіх прывілей, ніякіх асабістых выгод яе членам. ДНД, рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці, навуковыя гурткі абавязковыя для іх, як і для астатніх студэнтаў.

Чым жа на працягу многіх гадоў займаецца дружына па ахове прыроды? Кожны студэнт біялагічнага факультэта, які запісваецца ў дружыну, атрымлівае пасведчанне грамадскага інспектара Дзяржкамітэта па ахове прыроды. Многія з хлопцаў маюць іншы дакумент: яны залічаны няштатнымі супрацоўнікамі абласной інспекцыі палявання ці абласной рыбнай інспекцыі. Такое званне атрымліваюць лепшыя з лепшых, самыя ініцыятыўныя і добрасумленныя дружыннікі

Гісторыя дружыны ўтрымлівае шмат цікавейшых, часам нават смешных здарэнняў. Справа ў тым, што не заўсёды і не ва ўсіх людзей у сітуацыі «злоўленага за руку» хапае мужнасці весці сябе з пачуццём уласнай годнасці.

...Быў выпадак, расказвае Міша Максіменкаў, калі прынялі леснікоў за браканьераў. Я стаяў крыху збоку, у дазоры, а астатнія цішком прабіраліся цераз ельнік. Бачым — дым, чуем — звычная гаворка, раз-пораз стрэлы і смех нейкі... нядобры. Хлопцы раздзяліліся на групы і акружылі «браканьераў». А калі ўсё высветлілася, столькі жартаў было: успаміналі свае ваяўнічыя твары і позы, разгубленых ад нечаканасці леснікоў.

А зараз некалькі слоў аб аперацыі «Ёлачка». Наўкола біяфака раскінуўся прыгожы парк. Багаты рэдкімі дэкаратыўнымі пародамі дрэў, ён даўно чакаў абаронцаў, бо жыхары бліжэйшай вёскі унікальныя дрэвы пілуюць на звычайныя дровы, а пад Новы год рады местачкоўцаў папаўняюць спрытныя гараджане, і гэта нашэсце пакідае за сабой жудасную карціну. Вось у такія перадсвяточныя імгненні паяўляюцца на лясной паляне Юра Ганчарук, Міша Максіменкаў і іх сябры. Спілаванае дрэва зноў не прарасце, а вось злодзей аплоціць не толькі кошт ёлкі, але і штраф.

Такіх студэнцкіх дружын у Мінску шмат. І біяфакаўская далёка не самая буйная сярод іх. Але ці гэта галоўнае? Галоўнае, што ёсць людзі, якія робяць усё неабходнае, каб ніколі лясы не былі нямымі, рэкі — мёртвымі.

**А. МЯНЬКО.**



У студэнцкім асяроддзі існуе гадамі праверaная ісціна: самы цяжкі час для вучобы — вясна. Надта ўжо многа адцягваючых увагу момантаў. Тут табе і сонейка, няпрошаным госцем зазірнуўшае ў аўдыторыю, і падараваная аднакурснікам галінка квітнеючай яблыні, і — якая ж вясна без кахання — бясконцыя прагулкі ўдваіх сярод бушуючай зеляніны сквераў.

Але... Наперадзе сесія. І студэнты 2-га курса вытворчага патока хімічнага факультэта добра гэта разумеюць, таму і лекцыю кандыдата фізіка-матэматычных навук Маргарыты Давыдаўны Балабоевай слухаюць асабліва ўважліва.

Фота **В. Шачака.**



## ● ДАТЫЧЫЦЬ КОЖНАГА

# Гігіена разумовай працы

АДНА З АСНОЎНЫХ сацыяльных задач — здароўе для ўсіх. Гэты лозунг Сусветнай арганізацыі аховы здароўя абавязвае не толькі органы аховы здароўя, але і саміх грамадзян перагледзець спосаб свайго жыцця, паклапаціцца аб захаванні здароўя.

Важным элементам здаровага спосабу жыцця з'яўляецца правільная арганізацыя працы і адпачынку. Гэта лепш за ўсякія іншыя сродкі ўмацоўвае арганізм чалавека, яго нервовую сістэму.

Для разумовай працы вялікае значэнне мае арганізацыя рабочага месца, вытворчая эстэтыка. Тэмпература ў памяшканні не павінна раздражняць ці адцягваць увагу. Духата, тытунёвы дым, пабочныя пахі —не лепшыя спадарожнікі чалавека. Важную ролю адыгрывае зручная мэбля, афарбоўка сцен, парадак на рабочым месцы. Святло — вялікі стымулятар нервовай сістэмы, таму яго ўздзеянне на працаздольнасць чалавека вельмі вялікае. Лепшы від асвятлення — рассеянае сонечнае святло. На рабочы стол святло павінна падаць злева. Вечарам, акрамя агульнага асвятлення, павінна быць настольная лямпа. А каб засяродзіць увагу, можна выключыць агульнае святло.

Разумовая праца патрабуе засяроджанасці. Пабочны шум, размовы адцягваюць увагу і зніжаюць прадукцыйнасць працы.

Сур'ёзную работу патрэбна выконваць непасрэдна пасля асвяжаючага сну.

Прадукцыйнасць разумовай працы залежыць ад рытмічнасці, планавасці, трэніроўкі, а таксама сацыяльных фактараў. Прывычная паслядоўнасць і пэўная сістэма ў рабоце, планавая дзейнасць заўсёды даюць добрыя вынікі.

У любой справе патрэбна ісці пастаянна ад простага да складанага, ад малога да вялікага, ад лёгкага да цяжкага. Паступовае пераадоленне ўзнікшых пры рабоце цяжкасцей дапамагае чалавеку правільна мабілізаваць і рацыянальна выкарыстоўваць свае сілы.

Практыкаванні і трэніроўкі садзейнічаюць больш эканамічнай дзейнасці арганізма. Вопытны чалавек лёгка і хутка выконвае план сваёй работы. Уся наша працоўная дзейнасць заснавана на набыцці складаных умоўных рэфлексаў. Сістэма гэтых рэфлексаў, іх сукупнасць фіксуецца карой галаўнога мозгу і складае стэрэатып работы. У кожнага чалавека свой дынамічны стэрэатып работы і адпачынку. Гэта неабходна ўлічваць пры перапынках. Яны павінны быць дастатковыя для адпачынку, але не вельмі доўгія, каб захаваць рабочы тонус.

Засяроджаная ўвага — гэта яшчэ адно з асноўных правілаў мыслення. Ньютан сцвярджаў, што ён зрабіў свае адкрыцці таму, што увесь час пра іх думаў. Прыпомніце, як часам цяжка вярнуцца да работы пасля таго, як ваша ўвага была адцягнута нечым іншым.

Вялікае значэнне мае эмацыянальны пад'ём. Калі работа цікавая, яна менш стамляе, лёгка выконваецца, прыцягвае да сябе, ад яе цяжка адарвацца. Д. І. Мендзялееў суткамі не спаў, працуючы над сваёй перыядычнай сістэмай элементаў і не адчуваў стомленасці.

Дастатковы, своечасовы і добра арганізаваны адпачынак з'яўляецца адным з важнейшых сродкаў павышэння працаздольнасці і захавання здароўя чалавека. Адпачываць можна многа, але дрэнна, і наадварот — мала, але добра.

Адпачынак не павінен быць пасіўным. У яго павінны ўваходзіць элементы руху: лёгкая фізічная работа, фізкультура, спорт, прагулкі. Актыўны адпачынак хутчэй і паўней аднаўляе дзейнасць стомленага арганізма.

Пераключэнне на іншы від разумовай дзейнасці, змена ўражанняў — гэта таксама адпачынак. Адсутнасць нармальнага адпачынку вядзе да зніжэння працаздольнасці, пераутамлення, а пераутомлены чалавек лягчэй можа захварэць і цяжэй пераносіць хваробу.

Грамадзяне СССР маюць права на адпачынак, які забяспечваецца аплачваемым водпускам. Гэтае права — жыццёва важная неабходнасць, ім патрэбна ўмець карыстацца. Той, хто не адпачывае на працягу шэрагу гадоў, падрывае сваё здароўе, горш працуе.

Адпачываць у час водпуску рэкамендуецца не ў звычайных умовах, не там, дзе чалавек працуе і жыве, а патрэбна перамяніць абстаноўку, вызваліцца ад думак аб паўсядзённай рабоце.

Кожны савецкі чалавек мае ўсе магчымасці і абавязаны клапаціцца аб сваім здароўі. У нашай краіне здароўе чалавека — народны набытак. Берагчы яго—не толькі асабістая справа кожнага, але і грамадзянскі абавязак.

**В. АЛЕКСАНДРОВІЧ,**
**урач Мінскай гарадской санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, заслужаны ўрач БССР.**

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# ЯГО ХОБІ

УЖО ТРЭЦІ ГОД Пётр Малевіч, студэнт II курса ФПМ з'яўляецца членам рэдкалегіі факультэцкай газеты «Алгарытм». Гэта той чалавек, без якога не можа абысціся газета, хаця абавязак Пеці выглядае спачатку даволі сціплым. Сапраўды, здаецца, якая там цяжкасць па-мастацку аформіць газету. Але гэта толькі на першы погляд. А на самай жа справе ўсё па-іншаму. Патрэбна ўменне валодаць фарбамі, дакладна, у адпаведнасці са зместам, падабраць малюнак. І патрэбен час. Мне не раз даводзілася назіраць, як «шчыраваў» над газетай Пеця. Уявіце сабе: перад вамі — вялікі белы аркуш паперы, артыкулы для газеты, фарбы і больш нічога. Але Пеця не губляецца і смела бярэцца за справу. А праз некалькі гадзін у яго руках свежая, прыгожа аформленая газета.

— Так, я люблю маляваць, гэта мае хобі, — гаворыць Пеця Малевіч.

Гэта добра, што ў Пеці ёсць сваё хобі, якому ён аддае большую частку свайго вольнага часу. Але як гэта ўплывае на вучобу, ці не перашкаджае займацца?

— Хутчэй наадварот. Мастацтва дае мне добрую разрадку пасля лекцый і практычных заняткаў, прыносіць эстэтычнае задавальненне і, самае галоўнае, з'яўляецца сапраўдным адпачынкам, што ў сваю чаргу спрыяе грунтоўнаму засваенню матэрыялу.

Гэта сапраўды так, бо зімовую сесію Пётр Малевіч здаў амаль што на адны пяцёркі. Поспехаў табе, Пеця, у летняй сесіі!

**Ф. ШУМЧЫК,**
**студэнт філалагічнага факультэта, слухач аддзялення журналістыкі ФГП.**

# Мабілізуючым словам

У ІНСТЫТУЦЕ ПАВЫШЭННЯ кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук БДУ імя У. І. Леніна вялікая ўвага ўдзяляецца прапагандзе ведаў сярод насельніцтва рэспублікі. Ставіцца задача, каб кожны выкладчык, што прыехаў у ІПК, актыўна ўдзельнічаў у лекцыйнай прапагандзе.

У мінулым годзе такую работу вялі 17 выкладчыкаў і 382 слухачы. За год імі прачытана 2598 лекцый, з іх: 670 па матэрыялах 60-годдзя ўтварэння СССР, 95 па Харчовай праграме.

Расшырэнню лекцыйнай прапаганды садзейнічае вялікая арганізацыйная работа, якая вядзецца таварыствам «Веды» ІПК.

У пачатку кожнага набору фарміруецца бюро таварыства, а на сходах кафедраў выбіраюцца кафедральныя бюро. На ўвесь час заняткаў складаюцца спісы лектараў-слухачоў з тэматыкай падрыхтаваных лекцый, якія рассылаюцца ў раённыя арганізацыі таварыства «Веды» Мінска.

Кіраўнікі бюро кафедраў атрымліваюць памятку па арганізацыі лекцыйнай прапаганды. Раз у месяц яны збіраюцца для абмену вопытам і падвядзення вынікаў сваёй работы.

У лекцыйнай прапагандзе шырока выкарыстоўваюцца розныя формы і метады работы. Напрыклад, праведзены чатыры вечары дружбы, арганізаваны чатыры «круглыя сталы», тры навуковыя канферэнцыі, два тэматычныя вечары.

З кожным наборам усё большая ўвага ўдзяляецца арганізацыі калектыўных выхадаў слухачоў для чытання лекцый. У 1982 годзе такіх выхадаў на МТЗ, МАЗ, ВА «Інтэграл» і ў іншыя калектывы арганізавана 26.

На кожнай кафедры ёсць экраны ўдзелу слухачоў у лекцыйнай прапагандзе. Заведзены журналы па прыёму заказаў на чытанне лекцый і журналы ўліку прачытаных лекцый.

Работу групы таварыства «Веды» ІПК накіроўвае партыйная арганізацыя. Пытанні лекцыйнай прапаганды сістэматычна разглядаюцца на кафедральных партыйных сходах, а таксама некалькі разоў у год — на бюро або сходзе партыйнай арганізацыі ІПК.

Як правіла, у канцы кожнага набору самыя актыўныя лектары ўзнагароджваюцца Граматамі гарадской і рэспубліканскай арганізацый таварыства «Веды».

**І. СТУПНІКАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук, старшыня пярвічнай арганізацыі таварыства «Веды» ІПК.**



І мяне прадаюць...

Фотаэцюд **С. Плыткевіча.**

# Ружовы ранак

літаратурная старонка

Сяргей ЧЫГРЫН

## ПЛАНЕТА ДУБОЎ

Мой лес—
Планета дубоў,
Равеснік Міцкевіча і Цёткі.
Адчуў ён зух і сілу перуноў,
Як і вайны гарачыя асколкі.
Мяняліся падзеі, даты, дні,
Расці нам не хапала сілы,
Ад многіх засталіся толькі
пні,
Як ад герояў — вечныя
магілы.
Дзень шчаслівы
Сонца запаліў,
Дрэў прыгажосць паэтамі
апета.
Няхай заўжды красуе на
Зямлі
Дубоў маіх маленькая
планета!

## ВЯСНА

Перад летам
Доўга прыбіраліся
У садах, палях, на мурагу...
Вы пайшлі
І нат не развіталіся,
Я дасюль забыць Вас не
магу.

## АЎДЫТОРЫЯ ІМЯ Я. КУПАЛЫ

Сюды хацелася дайсці,
Філфак — жыцця працяг...
Праз аўдыторыю мудрасці
Наш праходзіць шлях.

## У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

Гісторыю складае,
Круцячы нас, планета...
Імёны герояў чытаю
На бронзавых білетах.

***

Возера майго вясла
Як дзень — святлее,
Ноч — цямнее.
І ты была,
І ты цвіла,
Як на вадзе лілея.
Было далёка да сяла
Там, дзе пляткарыць лісце...
Ты ў возеры майго вясла
Шукала выйсце.



Ганна ВЯЗІЦКАЯ

***

Мы з табою разышліся,
Спыніўшыся на паўслове,
І згубіліся ў лабірынце
гарадскіх вуліц.
А зараз, калі так патрэбны
адзін аднаму,
Пільна шукаем сустрэчы.
Але ўсё дарэмна —
Толькі адзіны выпадак можа
сутыкнуць нас.
А ці будзе ён?..

Валянціна МІСЮК

## ВЯСНОВЫ ПЕЙЗАЖ

У вясновых дажджах
Заблудзіліся светлыя лозы--
Задуменныя песні
У кволай аздобе лісцінак.
Птушкі ў неба ўзнеслі
Мелодыю тонкіх галінак.
Абудзіліся лозы,
І заплакалі ціха жалейкі,
Пакаціліся слёзы
У халодную ноч, у завею...
У празрыстых дажджах
Нарадзіліся светлыя лозы.

## ВОЧЫ

Якія вы, вочы?
Колер блакітнага неба?
Колер беззорнай ночы?
Якія вы, вочы?
Мне вельмі патрэбна ведаць,
Каб сцежкай не размінуцца,
Калі яны азірнуцца,
Каб ветла мне ўсміхнуцца...
Якія вы, вочы?
Цвіце пралескамі ранак,
У зорах бярозка шапоча.
Ідзе па зямлі каханы.
Якія вы, вочы?..



Сады цвітуць. Фотаэцюд В. Шачака.

Міхась КАРПЕЧАНКА

...Звініць-залівaецца колаў
Круцёж.
Я зноў на радзіму вярнуся...
Вясенняе сонца. Па рэйках
Цягнік басанож.
Нібы немаўлятка па лузе...

***

Калыскай зыбнуўся
Рагаты месяц,
Павіс над сцішанай
Зямлёй.
Чародкі зорак
Зухавата
«Калінку» скачуць
Над ракой...

***

...Не варушы
Майго цярплівага кахання,
Збялелы ўспамін.
Пакінь!
Былую шчырасць
Не ўваскрэсіш —
Я і праз леты,
Нібы дым,
Згарэлага кахання
Усё чую прысмак
Гаркаты
Твайго апошняга
прызнання...

***

Твае, матуля, мазалі —
Вялікія і жоўтыя —
Нагадваюць мне хлеб,
Які толькі што досталі
З печы,—
Хлеб,
Спечаны на кляновых лістах
І замешаны мазолістымі
рукамі.



Алена ЗАБАРОНАК

## У МАЛДАВІІ

*СБА «Мара»*

Паўднёвая спёка.
Працуем, працуем...
Хвілінай сумуем —
Як вечар далёка!
Там песні гучалі,
Кружыліся ў танцах.
Хацелася там
Назаўсёды застацца.
Нам сніліся ўночы
Адны памідоры...
Цяпер неаднойчы
Аб гэтым гаворым.

***

Малдова, Малдова, Малдова!
Бывай, мая летняя песня!
Бывай, маё сонейка! Слова
Маё падарункам хай будзе.
Малдова, Малдова,
Малдова...
За вокнамі стрэне Палессе,
Пачуецца родная мова,
Сустрэнуць знаёмыя людзі.

Малдова, Малдова, Малдова,
Як ты для мяне цяпер
блізка!
У дрэў веснавая абнова:
Вэлюма белая замяць.
Малдова, Малдова,
Малдова...
Блукаю па вуліцах Мінска,
І хваляй гарачай, руж овай
На поўдзень нясе мяне
памяць.

Тацця на МАРЧЫК

***

Дабрыня.
Пяшчота.
Выпадковасць,
Захмялелы сэрцам мгненны
крык.
А ў небе залатой падковай,
Як загадка,
Выспеў маладзік.

***

Няўмольна дождж хлястаў аж
да світання,
Накінуўшы на плечы
туманы,
Не чула ў тую ноч твайго
прызнання,
Маўчання толькі плакалі
званы.
Не абяцаў кахання аж да
скону,
Не абяцаў пісаць з усіх
дарог.
Хацелася прызнання мне
палону,
А ты чамусьці шчырым быць
не мог.
Вакзал. Мяне праводзіў у
дарогу,
І раптам слоў імгненны
грамабой:
«Чакай мяне з усіх зямных
аблогаў,
Я проста не магу не быць з
табой».
Згараюць хвілі ў мяжы
сусвета,
Праходзяць дні маўклівай
чарадой.
А я нашу ў сэрцы вокліч
гэты
І пацалунак палымяны твой.

Іна ЯЦУХНА

***

Ох, сумленне маё, ты
заўсёды спазняешся,
Дзе знайсці мне мяжу паміж
злом і дабром.
Колькі раз гаварыла сабе:
«Не спяшайся,
Як гарчыць неабдуманасць
здзеклівых слоў».

На імгненне сарвуся,
закрэслю ўсе межы,
Чалавека пакрыўджу, а
потым не сплю,
Я ў вечнай пагоні за
ўласным сумленнем,
Выпраўляю памылкі і зноў
іх раблю.

Сяргей МЕЛЬНІКАЎ

## СТАРЫЕ ДОМА

Мне жаль, пустеют старые
дома,
Былых времен седые
капитаны.
Их мемуаров старые тома
Меня зовут в неведомые
страны,

И, прикасаясь к таинству
родства,
Как ветер к голубиному
полету,
Ищу страниц заветные слова
И поколений прожитые годы:

Все было так, как и тогда,
цвела
На подоконнике герань,
смущаясь,
Хозяйка примус зажигала,
раздражаясь,
И, словно дворник, зимушка
мела.

Затем менялись осень и
весна,
И лестничные в клеточку
площадки
Прощали мячики и детские
лошадки,
Да за влюбленными маячила
луна...

Но как бы нас удача ни
венчала,
Как ни кружила века
кутерьма —
Я открываю старые тома
И начинаю с самого начала.

Аляксандр БЕЛЬСКІ

***

Запытаў падарожніка,
Што вярнуўся
З чужыны дадому:
— Чаго не хапала
У краіне далёкай?
Ён думаў нядоўга,
З хваляваннем прамовіў:
— Блакіту нябёсаў
І матчынай
Роднае мовы...


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

12 мая 1983 г. Зак. 903. АТ 04225

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ